**Родная мова**

Зь легэндаў і казак былых пакаленьняў,
З калосься цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменьняў,
З грымучага зьзяньня бурлівых крыніц.
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасьці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Сьвятыні народа, бясьсьмерця яго, –
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Няма на зямлі таго шчасьця і гора,
Якога б ты нам перадаць не магла.
Няма такіх нэтраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму, туды, дзе сягоньня
Стаіць акрываўлены вораг зь пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,
Над будучыняй і над песьняй маёй, –
Над тым, што было і што век будзе вольным.

Народ пранясе цябе, родная мова,
Сьвятлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і горы змаганьняў суровых.
Калі ж ападзе і разьвеецца дым
І нівы васкросшыя закаласяцца, –
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазьвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усьмешкай дзіцяці.

**Спатканне**

– Ну што ж, кажы, што ў вас чуваць? –
Пачаў стары пра сенажаць,
Успомніў жыта і авёс...
А вочы... мокрыя ад сьлёз...
А потым я загаварыў:
– Нічога, год я перажыў.
Ды не адзін – сядзіць нас шмат, –
Прывыклі трохі і да крат...
Ну, як там мама і сястра?
Пара ўжо на зіму араць.
І як там кратаецца дзед?
Ім занясі ад нас прывет!
– Нічога, мы-то жыць жывём, –
Вось ты тут сохнеш за муром...
Я ў торбе сухароў прынёс, –
А вочы мокрыя ад сьлёз...
– Не плач! Мы вернемся вясной
І ў поле выйдзем грамадой,
Сустрэнем новы ўсход зары, –
Не плач і не бядуй, стары!
Вясною сьветлаю з-за крат
Зь сяўнёю, поўнаю зярнят,
Нас выйдзе шмат, як цёмны бор,
На скібы чорныя разор...
Стары, я знаю, верыць мне
І сам гаворыць аб вясьне,
Здаецца, падужэў, падрос,
Хоць вочы мокрыя ад сьлёз...